# Весці БДПУ

**Штоквартальны навукова-метадычны часопіс.**
**Выдаецца з чэрвеня 1994 г.**

**№ 1(51) 2007**

**СЕРЫЯ 2.**
**Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія.**
**Эканоміка. Культуралогія**


## Змест


***Галоўны рэдактар:***
**П. Дз. Кухарчык**

***Рэдакцыйная калегія:***
Н. Г. Алоўнікава
А. І. Андарала
(*нам. галоўнага рэдактара*)
У. В. Амелькін
В. А. Бондар
М. К. Буза
В. В. Бушчык
(*нам. галоўнага рэдактара*)
Ю. А. Быкадораў
(*нам. галоўнага рэдактара*)
І. В. Бялько
А. М. Вітчанка
С. Я. Гайдукевіч
К. У. Гаўрылавец
А. А. Гіруцкі
В. М. Дабранскі
Л. М. Давыдзенка
А. В. Данільчанка
М. М. Забаўскі
В. Б. Кадацкі
Я. Л. Каламінскі
У. М. Калюноў
Л. В. Камлюк
Л. А. Кандыбовіч
І. В. Катляроў
П. В. Кікель
Г. А. Космач
У. М. Котаў
Н. І. Кунгурава
М. В. Лазаковіч
І. Я. Леваш
М. І. Лістапад
А. М. Люты
У. А. Мельнік
І. А. Новік
В. М. Русак
А. І. Смолік
В. Дз. Старычонак
В. Б. Таранчук
А. І. Таўгень
І. С. Ташлыкоў
В. М. Фамін
А. Т. Федарук
А. С. Цернавы
Л. Н. Ціханаў
І. І. Цыркун
М. Г. Ясавееў


### *Гісторыя*


*Пуцік У. С.* Асвятленне гісторыкамі ўздзеяння сацыяльных працэсаў у аграрнай сферы вытворчасці на грамадска-палітычнае жыццё Беларусі (канец XIX — пачатак XX ст.) .......... 3

*Біндараў А. В.* Руская Праваслаўная Царква ў нацыянальна-рэлігійнай палітыцы расійскага самаўладдзя ў Беларусі ў 1894—1914 гг.: гістарыяграфічны і крыніцазнаўчы аналіз .......... 8

*Крывіцкая К. В.* Арганізацыя ўзброеных сіл Вялікага княства Літоўскага ў перыяд вайны 1812 г. .......... 12

*Зданкевіч К. В.* Судовая рэформа 1864 г. у Беларусі .......... 16

*Башмакоў А. А.* Гістарыяграфія гісторыі мануфактурнай вытворчасці ў Беларусі ў 1861—1900 гг. .......... 18

*Трубчык П. А.* Нацыянальнае пытанне ў дзейнасці канстытуцыйна-дэмакратычнай партыі ў Беларусі ў перыяд рэвалюцыі 1905—1907 гг. .......... 22

*Сарока А. Г.* Дзейнасць курсаў па перападрыхтоўцы загадчыкаў хат-чытален і народных дамоў у Савецкай Беларусі ў 20-я гг. XX ст. .......... 25

*Крыварот А. А.* Баявое ўзаемадзеянне беларускіх і расійскіх партызанскіх фарміраванняў 1942—1944 гг. .......... 30

*Рабцава Н. А.* Падрыхтоўка кваліфікаваных рабочых кадраў чыгуначнага транспарту ў перыяд аднаўлення народнай гаспадаркі Беларусі (1944—1950 гг.) .......... 35

*Янкоўская Т. У.* Дзяржаўная палітыка ў сферы працы і занятасці моладзі Беларусі ў 90-я гг. XX ст. .......... 38

*Дзмітрук І. П.* Дзейнасць органаў дзяржаўнага кіравання ў сферы маладзёжнай палітыкі: (1992—1994 гг.). .......... 42

*Бурая Н. В.* Уплыў дзяржаўнай палітыкі на развіццё нацыянальных і канфесіянальных адносін у Беларусі (1992—2004 гг.) .......... 46

*Субоцін А. Г.* Канфлікт Баварыі і рэйха. 1922 г. .......... 49

*Скарабагатая І. А.* Палітычная дзейнасць нацыянал-сацыялістаў Аўстрыі ў гады сусветнага эканамічнага крызісу (1929—1932 гг.) .......... 53

*Воранава Т. В.* Францыя і ФРГ: праблемы ўзаемаадносін у 80-я гг. XX ст. .......... 56


### *Філасофія*


*Кузняцоў А. У., Таркан І. І.* Касмацэнтрычная парадыгма сацыяльных ведаў і сучасны дыялог культур .......... 60

*Крыштаповіч Я. А.* Метакультурныя асновы гістарычнага працэсу .......... 64

*Ігнатовіч А. Л.* Неасакратаўскі метад у рашэнні праблем пазнання .......... 68

*Шымбалёў А. А.* Навуковае пазнанне і астралогія .......... 72

*Сайганава В. С.* Нормы навуковай рацыянальнасці і іх гістарычная дынаміка .......... 78


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

9. *Ленин, В. И.* К вопросу о нашей фабрично-заводской статистике / В. И. Ленин // Полн. собр. соч. — 5-е изд. — М., 1959. — Т. 4. — С. 1 — 34.
10. *Чепко, В. В.* Сельское хозяйство Белоруссии в первой половине XIX века / В. В. Чепко / Ин-т истории НАН Беларуси. — Минск: Наука и техника, 1966. — 220 с.
11. *Вишневский, А. Ф.* Социально-экономическое развитие городов Белоруссии в период кризиса феодализма (30 — 50 гг. XIX в.): автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.02 / А. Ф. Вишневский; Мин. гос. пед. ин-т. — Минск, 1973. — 24 с.
12. *Полетаева, Н. И.* Купечество Беларуси, 60-е гг. XIX — начало XX в. / Н. И. Полетаева. — Минск: Белорус. гос. экон. ун-т, 2004. — 247 с.
13. *Шыбека, З. В.* Гарады Беларусі (60-я гады XIX — пачатак XX стагоддзяў) / З. В. Шыбека. — Мінск: ЭўроФорум, 1997. — 320 с.
14. *Жытко, А. П.* Дваранства Беларусі перыяду капіталізму. 1861 — 1914 / А. П. Жытко. — Мінск: БДПУ, 2003. — 233 с.
15. *Люты, А. М.* Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў другой палове XVIII — першай палове XIX стагоддзя / А. М. Люты. — Мінск: БДПУ, 2004. — 322 с.

*SUMMARY*

*In the article the author speaks about the historygraphical sources that describe the manufacturing industry of Belarus of the second half of the XX th century. Within the paperwork the strengths and the weaknesses of the previous research were analyzed. Because of the lack of knowledge about the manufactory industry's development in the second half of the XX th century the research should be continued using the new methods of data collecting and compiling.*

---

*УДК 947. 083*

***П. А. Трубчык***

# НАЦЫЯНАЛЬНАЕ ПЫТАННЕ Ў ДЗЕЙНАСЦІ КАНСТЫТУЦЫЙНА-ДЭМАКРАТЫЧНАЙ ПАРТЫІ Ў БЕЛАРУСІ Ў ПЕРЫЯД РЭВАЛЮЦЫІ 1905—1907 гг.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У 1901 — 1904 гг. паскорылася ідэйна-палітычнае самавызначэнне буржуазна-ліберальнага лагера. У земскіх губернях складваўся «Саюз земцаў-канстытуцыяналістаў», за мяжой пад кіраўніцтвам П. Струве пачаў дзейнічаць «Саюз вызвалення». У 1905 г. на аснове гэтых арганізацый аформілася Канстытуцыйна-дэмакратычная партыя (КДП), якая ў хуткім часе стала галоўнай партыяй расійскага лібералізму. Больш таго, у вызначаны перыяд КДП займала значныя пазіцыі ў І і ІІ Дзяржаўных думах ўплывала на грамадска-палітычнае жыццё краіны.

У дадзеным артыкуле ставіцца мэта вызначыць і прааналізаваць пазіцыі партыі кадэтаў па нацыянальным пытанні.

Вылучаная тэма разглядалася ў працах М. М. Забаўскага [1] і А. Ф. Смалянчука [2]. Аднак заяўлены яе аспект патрабуе больш грунтоўнай распрацоўкі.

12—18 кастрычніка 1905 г. адбыўся ўстаноўчы з'езд КДП, на якім была прынята яе праграма. Першы яе пункт абвяшчаў роўнасць перад законам усіх расійскіх грамадзян без розніцы полу, веравызнання і нацыянальнасці. Усялякія саслоўныя адметнасці і абмежаванні асабістых і маёмасных правоў усіх этнічных груп насельніцтва прапаноўвалася адмяніць; гарантавалася свабода сумлення і веравызнання. Канстытуцыя павінна была забяспечыць усім грамадзянам права свабоднага культурнага самавызначэння, а менавіта «поўную свабоду ўжывання розных моў і дыялектаў у грамадскім жыцці, свабоднае заснаванне і ўтрыманне навучальных установ, сходаў, саюзаў і арганізацый, маючых мэтай захаванне і развіццё мовы, літаратуры і культуры кожнай народнасці» [3]. Правы народаў Расійскай імперыі на палітычнае самавызначэнне ў праграме не ўтрымлівалася. Увядзенне абласной аўтаноміі прадугледжвалася толькі для Каралеўства Польскага. У дадзеным выпадку адзначалася, што «дапускаецца магчымасць увядзення абласной аўтаноміі і ўтварэння абласных прадстаўнічых сходаў, выбраных на аснове ўсеагульнага выбарчага права і валодаючых правам удзелу ў заканадаўчай уладзе па пытаннях мясцовага значэння» [4]. Разам з тым, кадэты падкрэслівалі, што «практычнае ажыццяўленне гэтай ідэі на ўсёй тэрыторыі Расійскай імперыі з'яўляецца невырашальнай задачай, паколькі само пытанне аб формах аўтаноміі і, у прыватнасці, аб межах аўтаномных абласцей можа выклікаць рознагалоссі і ўзмацніць нацыянальную барацьбу». Па гэтай прычыне «пытанне аб абласной аўтаноміі можа быць вырашана толькі пасля ўсталявання правоў грамадзянскай свабоды і народнага прадстаўніцтва з канстытуцыйнымі правамі» [5]. Зыходзячы з гэтага, цэнтральным пунктам кадэцкай нацыяналь-

най праграмы было патрабаванне культурнага самавызначэння народнасцей, якія ўваходзілі ў склад Расійскай імперыі.

У Беларусі ў 1905 — 1906 гг. арганізацыі кадэтаў існавалі ў Магілёве, Гомелі, Пінску і Віцебскай губерні. У час рэвалюцыі 1905 — 1907 гг. у мясцовыя партыйныя арганізацыі ўваходзілі і прадстаўнікі сацыяльных нізоў: рабочыя, рамеснікі, служачыя, сяляне [1, с. 20]. Для пашырэння свайго ўплыву сярод насельніцтва выдаваліся мясцовыя органы друку. У Паўднёва-Заходнім краі належалі кадэтам ці іх падтрымлівалі: «Северо-западный голос», «Новая заря», «Свободное слово», «Голос провинции», «Витебская жизнь», «Могилевский голос» [6]. 6 студзеня 1906 г. выйшаў першы нумар кадэцкай газеты «Могилевский голос». У перадавым артыкуле паведамлялася, што газета ставіць сваёй мэтай «пасільнае служэнне ўсеагульнай палітычнай свабодзе, усеагульнаму паўнапраўю і раўнапраўю, і эканамічным інтарэсам працоўных мас насельніцтва» [7]. У «Могилевском голосе» 16 лютага 1906 г. былі надрукаваны асноўныя палажэнні кадэцкай праграмы: «каб усе рускія грамадзяне былі роўныя перад законам, каб сам народ меў магчымасць склікаць сходы, гаварыць і чытаць, маліцца і вучыцца на сваёй мове, каб руская зямля была канстытуцыйна-дэмакратычнай манархіяй» [8].

У Віцебскай губерні органам друку мясцовага аддзела КДП была газета «Витебская жизнь». Яна таксама змяшчала праграмныя палажэнні партыі і заклікала мясцовае насельніцтва падтрымаць партыю кадэтаў на выбарах у І Дзяржаўную думу [9].

Але такое становішча ў заходніх губернях было не паўсюдна. Для заснавання масавых аддзелаў кадэтаў не існавала спрыяльнай сацыяльнай глебы (з-за адсутнасці земстваў і вышэйшых навучальных устаноў). Акрамя таго, у Мінскай, Магілёўскай, Віленскай губернях існавала афіцыйная забарона на дзейнасць кадэтаў, паліцыя не дапускала іх сходаў і, тым больш, стварэння мясцовых камітэтаў [10]. Гэтыя акалічнасці вымушалі канстытуцыйных дэмакратаў пераносіць сваю дзейнасць у нацыянальныя групы польскіх, яўрэйскіх і літоўскіх арганізацый. Найбольш яскрава гэта праявілася ў час перадвыбарчай кампаніі і ў перыяд дзейнасці І Дзяржаўнай думы.

Так, у Мінскай губерні быў утвораны Прагрэсіўны блок, у які ўвайшлі кадэты, Польская незалежная партыя, Беларуска-літоўская партыя, Перадвыбарчы камітэт землеўладальнікаў Мінскай губерні, перадвыбарчыя камітэты гарадскіх выбаршчыкаў рускіх, палякаў, яўрэяў [11]. У Магілёве кадэты ўступілі ў блок з «Саюзам дасягнення раўнапраўя яўрэяў у Расіі» [12].

Прытрымліваючыся такой тактыкі на выбарах у І Дзяржаўную думу, — з 478 выбраных дэпутатаў — 179 чалавек належалі да партыі кадэтаў [13].

У І Думе нацыянальныя і абласныя арганізацыі стварылі Саюз аўтанамістаў, які ставіў задачу абмеркавання і аховы ўсіх пытанняў, звязаных з правамі нацыянальнасцей і цэнтралізацыі. У гэты саюз, які не праводзіў самастойнай палітыкі, увайшлі і дэпутаты ад КДП. Для кадэтаў бясспрэчным было палажэнне аб прамой сувязі нацыянальнай свабоды з рэалізацыяй ідэі прававога будаўніцтва. У сувязі з гэтым лідэр партыі П. М. Мілюкоў пісаў, што адносіцца з вялікай насцярожанасцю да Саюза аўтанамістаў у І Думе. «Пытанні нацыянальныя самі па сабе стваралі пагрозу ўскладніць пытанні сацыяльныя і канстытуцыйныя, якія складалі нашу галоўную задачу», — адзначаў ён пазней. Аб'яднанне нацыянальных дэпутатаў прывяло б, на яго думку, да «павелічэння патрабаванняў найменш падрыхтаваных да аўтаноміі народнасцей» [14, с. 246].

Неабходна адзначыць, што Саюз аўтанамістаў аб'ядноўваў дэпутатаў, якія прадстаўлялі нацыянальныя супольнасці і ўваходзілі ў склад розных партый і нацыянальных арганізацый. Першае палажэнне сцвярджала, што Саюз утвараецца на «абласной або тэрытарыяльна-нацыянальнай аснове для ўзаемнай падтрымкі і абароны», а таксама «дзеля ажыццяўлення аўтаномнай ідэі на дэмакратычных пачатках». Праграма прызнавала непадзельнасць Расійскай дзяржавы, але лічыла неабходным «поўную дэцэнтралізацыю дзяржаўнага кіравання на падставе прынцыпу шырокай аўтаноміі асобных абласцей» [2, с. 199]. Геаграфічныя і прававыя межы аўтаноміі кожнай асобнай вобласці вызначаліся адпаведна пажаданням яе насельніцтва. Для абласцей з этнічна змешаным насельніцтвам прадугледжвалася прыняцце законаў, якія павінны былі гарантаваць правы нацыянальных меншасцей перш за ўсё ў галіне ўжывання роднай мовы ў школе, судзе, грамадскіх і ўрадавых установах. «Асноўныя палажэнні» патрабавалі юрыдычнага забеспячэння за ўсімі грамадзянамі «права на культурнае і нацыянальнае самавызначэнне, знішчэнне ўсіх прывілеяў і абмежаванняў, абумоўленых прыналежнасцю да той або іншай нацыянальнасці, да таго або іншага веравызнання» [15]. Фактычна галоўнай ідэяй аб'яднання было імкненне прадстаўнікоў шматлікіх «нярускіх» народаў дамагчыся аўтаномнага кіравання для сваіх рэгіёнаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Партыя кадэтаў не толькі імкнулася накіраваць дзейнасць нацыянальных груп у Думе ў канстытуцыйнае рэчышча, суаднесці яе з іншымі агульнадзяржаўнымі пытаннямі, а і ў ліку першых заканадаўчых ініцыятыў прапанавала праекты, якія ў поўнай ступені былі накіраваны на змяненне становішча народаў Расіі.

15 мая 1906 г. 151 дэпутатам Думы быў прапанаваны праект закона аб грамадзянскім раўнапраўі. Для кадэтаў гэта пытанне мела прынцыповае значэнне. Прафесар М. А. Грэдэскул, які з'яўляўся адным з кіраўнікоў КДП, адзначаў, што «дзяржава, пабудаваная на нераўнапраўі грамадзян, нясе ўнутры самой сябе насенне барацьбы і распаду» [16].

Праект, прапанаваны на разгляд Думы 5 чэрвеня 1906 г., тры дні абмяркоўваўся дэпутатамі. Прапаноўвалася выпрацаваць чатыры групы законапраектаў па ліквідацыі абмежаванняў у правах розных пластоў насельніцтва — сялян, іншародцаў і неправаслаўнага веравызнання, а таксама абмежаванняў, якія тычыліся прывілеяў дваран і правоў жанчын. У дыскусіі прынялі ўдзел 29 дэпутатаў. Большасць выступіла за стварэнне спецыяльнай камісіі з 33 чалавек для распрацоўкі гэтых законапраектаў.

Галоўны дакладчык, спецыяліст партыі кадэтаў па нацыянальным пытанні — Ф. Ф. Какошкін — падкрэсліў значнае разыходжанне паміж дэмакратызмам шырокіх мас і заканадаўствам, для якога характэрна няроўнасць па саслоўях, нацыянальных і рэлігійных прыкметах, чаго няма ні ў адной культурнай дзяржаве. Апладысментамі быў падтрыманы заклік Ф. І. Родзічава: «Усе нярускія народнасці, якім бы цяжкім не было іх існаванне, павінны мець права называць Расію сваёй бацькаўшчынай» [17]. Пры гэтым у цэнтры ўвагі апынулася пытанне аб нацыянальных і рэлігійных абмежаваннях у становішчы яўрэяў і мусульман. У прыватнасці, хоць прамых выказванняў супраць адмены абмежаванняў, якія датычыліся яўрэяў не было, прагучала думка, што ўвядзенне адначаснага поўнага раўнаправія яўрэяў — вельмі складаная задача. Гэта пытанне немагчыма вырашыць з дапамогай чырвонага алоўка, лічыў П. А. Гейдэн. «Неабходна выпрацаваць складаны закон, — адзначаў ён. — Неабходна даказаць, што роўнасць не прынясе ім шкоды» [17, с. 1051].

Дыскусія вакол праекта закона аб грамадзянскім раўнапраўі скончылася абраннем 9 чэрвеня 1906 г. спецыяльнай камісіі 33-х па расследаванні незаконных дзеянняў адміністрацыі. Аднак гэта камісія не паспела завяршыць сваю работу, паколькі праз месяц І Дума была распушчана.

Пасля выбараў у ІІ Дзяржаўную думу колькасць кадэтаў зменшылася з 38 да 24% [18]. Тым не менш, кадэты разлічвалі, стварыўшы кампактную большасць, удзяліць асноўную ўвагу заканадаўчай працы ў галіне рэформы мясцовага самакіравання на шырокіх дэмакратычных пачатках, аграрнай рэформы і пашырэння правоў самой Думы. Як адзначала газета «Речь», партыя ідзе ў ІІ Думу «заканадаўнічаць, а не для таго, каб рабіць у ёй рэвалюцыю» [19]. Аднак стракаты склад дэпутатаў замарудзіў ажыццяўленне гэтых планаў. Кадэты змаглі ўсталяваць больш ці менш цеснае супрацоўніцтва толькі з казацкай і мусульманскай фракцыямі, аднак пагаднення як з крайне правымі, так і з сацыялістамі і трудавікамі не адбылося [20].

Нацыянальная праграма кадэтаў прадугледжвала «свабоднае культурнае самавызначэнне», «поўную свабоду ўжывання розных моў у публічным жыцці, свабоду заснавання навучальных устаноў і ўсякага кшталту сходаў, саюзаў і ўстаноў, якія ставяць мэтай захаванне і развіццё мовы, літаратуры кожнай народнасці і г. д.» [21]. Такія патрабаванні спрыялі стварэнню кадэцкіх камітэтаў на нацыянальных ускраінах Расіі, у тым ліку і ў беларускіх губернях.

Такім чынам, падчас дзейнасці ў І і ІІ Дзяржаўных думах для дэпутатаў ад КДП на першым плане стаялі сацыяльныя і палітычныя пытанні. Актыўнасць у нацыянальнай сферы пагражала ўскладненнем вырашэння гэтых пытанняў. Тым не менш, кадэты прапанавалі на разгляд Думы шэраг законапраектаў, накіраваных на стварэнне роўных ўмоў існавання для ўсіх народнасцей, якія насялялі Расійскую імперыю.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Літаратура і крыніцы


1. *Забаўскі, М. М.* Расійская Дзяржаўная дума ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі (1906 — 1917 гг.) / М. М. Забаўскі. — Мінск: БДПУ, 1999. — 212 с.
2. *Смалянчук, А. Ф.* Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй. Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях. 1864 — люты 1917гг. / А. Ф. Смалянчук. — СПб.: Неўскі прасцяг, 2004. — 406 с.
3. Политические партии России. Конец XIX — первая треть XX в. Документальное наследие. Съезды и конференции конституционно-демократической партии. 1905 — 1920: в 3 т. М.: Рос. полит. энцикл, 1997. — Т. 1. 1905 — 1907. — С. 34—35.
4. *Кокошкин, Ф.* Областная автономия и единство России. М., 1906. — С. 7.
5. О правах национальностей и децентрализации: докл. бюро съезду земских и городских деятелей 12 — 15 сент. 1905 г. и постановл. съезда. — М., 1906. — С. 32—34.

6. Политические партии России в период революции 1905—1907 гг.: Количественный анализ / Сб. ст. АН СССР. Ин-т истории СССР. — М.: АН СССР, 1987. — С. 122.
7. Могилевский голос. — 1906. — 6 янв.
8. Могилевский голос. — 1906. — 16 февр.
9. Витебская жизнь. — 1906. — 28 февр.
10. Речь. — 1906. — 2 марта.
11. *Марцюхова, М. А.* На переломе революции / М. А. Мартюхова. — Минск: Наука и техника, 1986. — С. 48.
12. Могилевский голос. — 1906. — 15 марта.
13. Думский сборник 1. Гос. Дума первого созыва (27 апр. — 8 июля 1906 г.). — СПб., 1907. — С. 9—10.
14. *Милюков, П. Н.* Воспоминания / П. Н. Милюков. — М.: Политиздат, 1991. — 527 с.
15. *Козбаненко, В. А.* Партийные фракции в I и II Государственных Думах России. 1906 — 1907 / В. А. Козбаненко. — М.: РОССПЭН, 1996. — С. 69.
16. *Гредескул, Н. А.* Проект закона о равноправии / Н. А. Гредескул // Первая Государственная Дума. — СПб., 1907. Вып. 2. — С. 113.
17. Государственная Дума. Стенограф. отчет. Первый созыв. Сессия I. Ч. 2. — СПб., 1906. — С. 1050.
18. *Каминка, А. И., Набоков В. Д.* Вторая Государственная Дума / А. И. Каминка, В. Д. Набоков. — СПб., 1907. С. 18, 21.
19. Речь. — 1906. — 30 окт.
20. *Томсинский, С. Г.* Борьба классов и партий во второй Государственной Думе / С. Г. Томсинский. — М.: Красная новь, 1924. — С. 22.
21. Конституционно-демократическая партия. Съезд 12—18 окт.

SUMMARY

*The article focuses on the political activity of the Constitutional-Democratic Party during the Russian Revolution of 1905—1907. The author of the article gives the detailed analysis of the party programm on the problems of nationalites. The article concentrates on Constitutional-Democratic Party's activity in Belorussian gubemiys, especially on its communications within the national parties and groups. The author pays attention to the position Constitutional-Democratic Party in Russian Parliament. The conclusion is that CDP gave more concem to the social and political problems. It was difficult to promote and solve national problems in Russian Parliament, but the Constitutional-Democratic Party nevertheless proposed some law projects for national equality and, development in Russia.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*УДК 947.6:02*

***А. Г. Сарока***

# ДЗЕЙНАСЦЬ КУРСАЎ ПА ПЕРАПАДРЫХТОЎЦЫ ЗАГАДЧЫКАЎ ХАТ-ЧЫТАЛЕНЬ І НАРОДНЫХ ДАМОЎ У САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ Ў 20-я гг. XX ст.

З пачаткам усталявання савецкай улады на тэрыторыі Беларусі пачаліся змены ў розных сферах грамадства. Савецкае кіраўніцтва імкнулася ліквідаваць недахопы ў культурным жыцці насельніцтва. З гэтай мэтай пачалі ствараццa культурна-асветніцкія ўстановы: хаты-чытальні, народныя дамы, клубы, бібліятэкі, чырвоныя куткі і г. д. Асноўнай праблемай у дзейнасці гэтых устаноў была адсутнасць спецыяльна падрыхтаваных, адукаваных кадраў для кіраўніцтва імі. Сістэматычная іх перападрыхтоўка з'яўлялася важным месцам у дзяржаўнай палітыцы краіны. Тэма працы курсаў па перападрыхтоўцы загадчыкаў хат-чытален і народных дамоў спецыяльна не разглядалася ў гістарычнай літаратуры. У сваіх працах такія аўтары, як П. Сіліванчык [1], О. В. Сафонава [2], М. А. Бяспалая [3], Е. В. Маскоўкіна [4] толькі абазначаюць праблему недахопу і нізкага ўзроўню падрыхтаванасці культасветных кадраў і называюць курсавую працу адным з галоўных мерапрыемстваў па вырашэнні адзначаных недахопаў. Найбольшую цікавасць выклікае праца Э. Б. Яршовай [5], аднак храналагічна яна ахоплівае толькі апошнія гады другога дзесяцігоддзя XX ст. і не дае ўяўлення аб складзе слухачоў, асаблівасцях выкладання на курсах.

Мэтай дадзенага артыкула з'яўляецца даследаванне працы курсаў па перападрыхтоўцы загадчыкаў народных дамоў і хат-чытален, іх арганізацыі, складу слухачоў, відаў дзейнасці на курсах і іх вынікаў.

Аб існаванні сур'ёзных кадравых праблем у хатах-чытальнях і народных дамах сведчаць наступныя лічбы. Так, па звестках на 1925 г., сярод 73 работнікаў культурна-асветніцкіх устаноў Барысаўскай акругі 51 чалавек меў ніжэйшую адукацыю, а спецыяльную падрыхтоўку атрымаў толькі 21 культасветнік [6, л. 248]. У Калінінскай акрузе толькі 12 са 104 чалавек прайшлі праз розныя падрыхтоўчыя курсы пры Галоўным палітыка-асветным камітэце БССР (ГПА) [7, л. 42]. Такая ж сітуацыя назіралася паўсюдна на тэрыторыі рэспублікі.

На XIII з'ездзе РКП(б) у 1924 г. адзначалася, што хата-чытальня з'яўляецца цэнтрам усёй культурна-асветніцкай работы ў вёсцы [8, с. 44]. Таму ўзмацненне яе апарату бачылася